ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 31 (864) ● ПЯТНІЦА, 10 лістапада 1972 г. Цана 2 кап. ● Год выдання XXVI

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

● **ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ** ● ВЫКЛАДЧЫКІ БДУ — ВЫКЛАДЧЫКАМ ШКОЛ ● **КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ** ● УНІВЕРСІТЭТ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ● **МЕТАДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ СТУДЭНТУ** ● СПРАВЫ ПЕРШАКУРСНІКАЎ

**Урачыста і радасна адзначыў свята Вялікага Кастрычніка калектыў нашага універсітэта.**

**На факультэтах адбыліся святочныя пасяджэнні і вечары.**

**У калонах дэманстрантаў студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі БДУ горача віталі 55-ю гадавіну Кастрычніка, з'яднаўшага народы нашай краіны ў адзіную сям'ю.**

## У КАМІТЭЦЕ КАМСАМОЛА

3 лістапада адбыўся прыём удзельнікаў Міжнароднай сустрэчы працоўнай моладзі, прадстаўнікоў маладзёжных арганізацый Гандураса, Гватэмалы, Дамініканскай Рэспублікі, Іспаніі і Бразіліі. Перад гасцямі выступілі С. А. Умрэйка—прарэктар па вучэбнай рабоце, А. Слука—сакратар камітэта камсамола. Яны расказалі аб універсітэце і яго камсамольскай і прафсаюзнай арганізацыях. Пасля адбылася экскурсія па універсітэту. Госці наведалі бібліятэку, спартыўную залу, кабінет гісторыі КПСС.



*НА ЗДЫМКУ: студэнт V курса аддзялення радыёфізікі Уладзімір КАЙГАРОДАЎ выконвае заказ адной з лабараторый кафедры радыёфізікі.*

Фота **Д. Чаховіча.**

# ЧЭРПАЮЦЬ ВОПЫТ НАСТАЎНІКІ

НА БАЗЕ універсітэта праходзяць перападрыхтоўку і ўдасканальваюць метады работы настаўнікі васьмігадовых і сярэдніх школ Мінскай вобласці.

Прафесарска - выкладчыцкі калектыў БДУ прымае актыўны ўдзел у рэалізацыі праграмы поўнага пераходу да сярэдняй адукацыі моладзі. На працягу раду год накоплен багаты вопыт работы з настаўнікамі гісторыі, геаграфіі, фізікі, хіміі, біялогіі, беларускай і рускай мовы і літаратуры. На лекцыях і практычных занятках настаўніцкіх курсаў калектыўная і самастойная тэарэтычная работа педагогаў спалучаецца з укараненнем навейшых дасягненняў навукі і перадавога вопыту ў практыку. Выкладчыкі універсітэта паведамілі слухачам пра свае навуковыя даследаванні ў розных галінах навукі, расказалі пра новыя публікацыі, манаграфіі, навуковыя артыкулы і іншыя працы.

У прафесіі настаўніка сярэдняй школы і выкладчыка вышэйшай навучальнай установы ёсць многа агульнага. Таму ўдзел у рабоце настаўніцкіх курсаў выкладчыкаў універсітэта вышэйшай кваліфікацыі меў асаблівае значэнне. Перад настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры, напрыклад, выступілі з грунтоўнымі лекцыямі прафесары А. А. Лойка, С. Х. Александровіч, Л. М. Шакун, дацэнты, кандыдаты філалагічных навук В. П. Рагойша, Я. М. Камароўскі, У. С. Карабан, М. Б. Яфімава, Л. І. Бурак, В. П. Красней, старшыя выкладчыкі М. Д. Міхей, Л. А. Царанкоў, З. М. Ціток, кандыдаты педагагічных навук Р. І. Вадэйка і У. П. Мешчаракоў.

Арганізацыяй вучэбна-выхаваўчага працэсу на курсах удасканалення настаўнікаў пастаянна цікавіліся прарэктар БДУ, член - карэспандэнт АПН СССР С. А. Умрэйка, загадчык кафедры беларускай літаратуры, член-карэспандэнт АН БССР І. Я. Навуменка, дэкан філалагічнага факультэта А. А. Волк, яго намеснікі У. М. Лазоўскі і М. М. Піпчанка, начальнік вучэбнага аддзела універсітэта В. С. Далгарукаў. Дзякуючы ім курсы прайшлі на высокім ідэйным і навукова-тэарэтычным узроўні.

Доктар філалагічных навук, прафесар А. А. Лойка прачытаў лекцыю аб вывучэнні паэтычных твораў у курсе роднай літаратуры 5-х і 6-х класаў. Адбылася вельмі цікавая размова з настаўнікамі аб сучасным стане развіцця беларускай савецкай паэзіі, адлюстраванні ў паэзіі характэрных рыс савецкага чалавека.

Аб вывучэнні празаічных твораў, іх ідэйна-мастацкіх вартасцей гаварыў у сваім дакладзе доктар філалагічных навук С. Х. Александровіч. Многа год прысвяціў даследчык вывучэнню беларускай літаратуры, шмат пісаў ён пра творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, Ц. Гартнага, М. Багдановіча, Ф. Багушэвіча, расказаў слухачам пра свае даследаванні.

З вялікай цікавасцю слухалі курсанты лекцыю прафесара Л. М. Шакуна «Асноўныя спосабы сучаснага беларускага словаўтварэння». Насычаная важнымі звесткамі аб сучасным стане развіцця беларускага мовазнаўства, лекцыя з'явілася ўзорам навуковай пабудовы публічнага выступлення.

Лектары БДУ звярталі асаблівую ўвагу на павышэнне ідэйнага ўзроўню сваіх слухачоў, пашырэнне іх кругагляду, агульнай культуры і на глыбокае авалоданне выкладаемымі і сумежнымі дысцыплінамі. Дацэнты В. П. Рагойша і У. С. Карабан, гаворачы аб прыёмах вывучэння элементаў тэорыі літаратуры ў васьмігадовай школе, рабілі патрэбныя і слушныя экскурсы ў падручнік па рускай літаратуры. У лекцыях па літаратуры добра прагучала тэма інтэрнацыянальных сувязей паміж брацкімі літаратурамі.

Некалькі гадоў запар выступаюць на курсах старшыя выкладчыкі універсітэта М. Д. Міхей і З. М. Ціток. Яны добра данеслі да слухачоў сутнасць праблемнага навучання.

На курсах удасканалення настаўнікаў геаграфіі выступілі з лекцыямі пяць прафесараў і дзевяць дацэнтаў універсітэта. Асабліва змястоўнымі і павучальнымі былі лекцыі прафесара А. Я. Шкляра аб навейшых звестках у будове і цыркуляцыі атмасферы, прафесара В. Р. Заўрыева аб актуальных праблемах фізічнай геаграфіі на сучасным этапе. Прафесар В. А. Дзяменцьеў паведаміў новыя даныя аб Сусветным акіяне.

З выкладчыкамі хіміі працавалі на курсах дацэнты універсітэта Ф. М. Капуцкі, В. Ф. Цікавы, А. Р. Улазава, М. Г. Рфальскі, П. М. Малашка.

Настаўнікам-біёлагам прачыталі лекцыі дацэнты В. С. Анохіна, Л. В. Кахновіч, старшыя выкладчыкі І. І. Саладоўкіна, Л. І. Ганжына, М. С. Марозік.

На філалагічным факультэце была арганізавана выстаўка сучасных наглядных дапаможнікаў — тэхнічных сродкаў навучання. У экспазіцыі былі прадстаўлены дыяпраектар ЛЭТІ-60 з дыстанцыйным кіраваннем, кадрапраектар «Гарызонт», дыяпраектар «Эцюд», новы фільмаскоп «Знотка». Наведвальнікі мелі магчымасць убачыць экранныя дапаможнікі, якія можна выкарыстаць на ўроках беларускай літаратуры у 4, 5, 6-х класах, а таксама у старэйшых класах. Гэта фрагмент кінафільма «Паўлінка», дыяфільмы «Янка Купала» і «Якуб Колас», дыяпазітывы на гісторыка-рэвалюцыйную тэму: «50 гадоў утварэння СССР», «Ленінскія Горкі», «Кабінет і кватэра У. І. Леніна ў Крамлі». На атэістычную тэму тут былі дыяпазітывы «Мастацтва і рэлігія», «Дасягненні навукі і рэлігія».

Усе камплекты дыяпазітываў прадстаўляліся разам з брашурамі - дапаможнікамі. Асабліва каштоўная «Гукавая кніга пра Леніна», матэрыялы якой могуць быць выкарыстаны не толькі на ўроках беларускай літаратуры, а і гісторыі, грамадазнаўства, выяўленчага мастацтва.

Усе слухачы курсаў наведалі памятныя мясціны горада, пабывалі ў музеях Янкі Купалы, гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і іншых.

**М. МАЛОЧКА.**

# Веcткі з факультэтаў

## ЮРФАК

● Да 55-й гадавіны Вялікага Кастрычніка быў прыўрочан традыцыйны вечар пасвячэння ў студэнты.

● Свята апошняга званка адбылося ў аўдыторыі № 433, адкуль пачалі свой студэнцкі шлях цяперашнія пяцікурснікі. На вечар былі запрошаны прадстаўнікі ўсіх курсаў юрфака. Адкрыў урачыстасць сакратар партбюро Я. А. Мацвіенка. Перад прысутнымі выступіў дэкан юрыдычнага факультэта І. С. Цішкевіч. Цёпла былі сустрэты словы яго наказу.

Стараста V курса Г. Шмак зрабіў апошнюю пераклічку. А потым са словамі падзякі звярнуўся да выкладчыкаў, работнікаў універсітэта ад імя сваіх таварышаў па курсу У. Хоміч.

Прымаючы эстафету традыцый выпускнікоў, студэнт IV курса М. Нiканоранкаў запэўніў старэйшых таварышаў, што іх пераемнікі дастойна пранясуць гэтую эстафету.

На вечары свае вершы прачыталі Цемнянкова, Матусевіч і іншыя студэнты. У знак падзякі сваім настаўнікам студэнты падарылі ім кветкі.

Першакурснікі, якія прысутнічалі на сходзе, пазнаёміліся яшчэ з адной добрай традыцыяй свайго факультэта.

● Лёгкаатлетычныя спаборніцтвы, арганізаваныя спорткамітэтам, вызначаліся сёлета масавасцю. Многія здалі нарматывы ГПА, выканалі спартыўныя разрады.

● Актыўна праходзіць на факультэце «Месячнік культуры паводзін». Камітэт камсамола, прафбюро праводзяць праверкі, рэйды. Некаторыя студэнты панеслі строгае пакаранне за недастойныя паводзіны.

Праводзяцца рэгулярныя рэйды ў інтэрнаты.

**Л. НОВІКАЎ.**

## ФІЗФАК

● У актавай зале універсітэта адбыўся сход студэнтаў фізічнага факультэта, якія жывуць у інтэрнаце № 7. Са справаздачай аб рабоце студэнцкага савета інтэрната выступіў яго старшыня Уладзімір Траццякоў. Ён расказаў аб рабоце камісій студэнцкага савета, звярнуў увагу на недахопы ў абсталяванні інтэрната. Тут жа быў выбран і новы састаў студсавета. Старшынёй яго стаў студэнт III курса фізфака Мікалай Карняйчук.

● На пасяджэнні прафбюро абмеркаваны планы работы камісій. З найбольшай адказнасцю да складання плана аднёсся старшыня жыллёва-бытавой камісіі Уладзімір Шматкоў. Намечан шэраг карысных мерапрыемстваў па паляпшэнню жыллёвых умоў студэнтаў.

**Карпункт прафкома.**

# УРОКІ МАЙСТЭРСТВА

**...Восьмая гадзіна вечара. Заняткі на журфаку ўжо скончыліся. Але ў адной з аўдыторый чуюцца галасы. Іх уладальнікі штосьці ўзбуджана абмяркоўваюць... На факультэце нараджаецца гурток рэцэнзентаў.**

**Ідэя стварэння гуртка, якая належыць выкладчыкам кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, адразу набыла сваіх энтузіястаў. Зразумела, што ўменне дакладна і цікава выказаць свае меркаванні аб мастацкім творы неабходна кожнаму культурнаму чалавеку, а журналісту тым больш.**

**...І вось вызначан напрамак работы, намечан план. На наступных занятках члены гуртка глыбей пазнаёмяцца з самім паняццем рэцэнзія, паслухаюць рэферат на гэтую тэму Галіны Канашэвіч, паведамленні Жаны Залознай і Таісы Дарафеенка аб тэатральнай і кінарэцэнзіі.**

**Занятні абяцаюць быць цікавымі. Гуртkоўцы сустрэнуцца з вядомымі беларускімі крытыкамі, абмяркуюць творы мастацтва. «Хатынская аповесць» А. Адамовіча і вершы, змешчаныя ў часопісе «Юность» за 1972 год,—вось першыя аб'екты дыскусій.**

**Прыходзьце ў гурток усе, хто хоча далучыцца да майстэрства рэцэнзента.**

**У. ГРЭЎЦАЎ.**

# ВЫРАТАВАЛЬНІКІ ЖЫЦЦЯ

**Так справядліва называюць донараў. І з кожным годам іх ва універсітэце становіцца ўсё больш. Аб гэтым красамоўна гаворыць апошні дзень донара, які праведзен 2 лістапада. У гэты дзень у паліклініцы БДУ, дзе праходзіў забор крыві, пабывала больш 400 студэнтаў і супрацоўнікаў. Многія з іх аказваюць дапамогу лячэбным установам Мінска ўжо не першы раз. Так, студэнт геаграфічнага факультэта В. Грыгор'еў здаў кроў шосты раз, па пяць разоў— студэнты В. Філатаў (фізфак), В. Батурын (хімфак), Г. Васільева (біяфак) і іншыя.**

**В. ІВАНОЎ.**

**Камсамольскае жыццё**

# СУПАКОЙВАЦЦА НЕ ПРЫХОДЗІЦЦА

Дакладчык сакратар камітэта камсамола В. Шкарупа шчыра расказаў, што не ўсё ў рабоце камітэта ішло гладка, не ўсе члены яго па-сур'ёзнаму аднесліся да сваёй працы. Абавязацельствы і планы некаторых курсавых арганізацый былі агульнага характару. Шэраг членаў камітэта камсамола заняў пазіцыю маўчальнікаў. У выніку аднаго, Аляксандра Собалева, прыйшлося вывесці з саставу камітэта, бо ён не толькі не спраўляўся з даручанай справай, але і дрэнна вучыўся. Аднак далёка не ўсе камсамольцы аднесліся да сваёй справы так, як Собалеў.

Вялікая работа праведзена акадэмічным сектарам. У пачатку першага семестра на малодшыя курсы былі накіраваны куратары з ліку членаў камітэта камсамола. Яны дапамагалі курсавым бюро ў падрыхтоўцы сходаў, у правядзенні конкурсу на лепшую акадэмічную групу. Акадэмічны сектар арганізаваў камісію, у састаў якой увайшлі адказныя за акадэмічную работу з курсаў. Задачы яе — кантроль за наведваннем заняткаў, высвятленне прычын адсутнасці студэнтаў на лекцыях. На пасяджэнні камісіі запрашаліся студэнты, якія мелі больш 12 пропускаў.

Пасля заліку былі складзены спецыяльныя карткі, дзе ўказваліся прычыны, па якіх той ці іншы студэнт не здаў залік.

Першае месца па паспяховасці заняў V курс, за ім IV і II.

Выдатна здалі зімовую сесію 140 чалавек. 117 з іх — камсамольцы; на добра і выдатна — 477, 411 з іх — камсамольцы (гэта з 727 камсамольцаў). Астатнія маюць тройкі, а некатырыя і двойкі.

Акадэмічны сектар разам з камітэтам камсамола падвёў вынікі конкурсу на лепшую акадэмічную групу. Пераможцай стала 2 група IV курса (камсорг Люба Несцяронак). Камсамольцы гэтай групы актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці, яны здалі зімовую сесію без адзінай тройкі (сярэдні бал 4,87). Узнагародай пераможцам была паездка ў Вільнюс і Каўнас.

Аднак, як падкрэсліў дакладчык, супакойвацца не прыходзіцца. Нягледзячы на тое, што ў параўнанні з летняй сесіяй 1971 года паспяховасць павысілася, у параўнанні з зімовай яна некалькі пагоршылася. Недастаткова працавалі на IV, III і II курсах. Не турбуюць тут запазычнікаў: не выклікалі нават на бюро. Так што клопат новаму камітэту ёсць. Многа непрыемнасцей прыносіць камсамольскай арганізацыі тая нязначная колькасць студэнтаў, што недастойна сябе паводзяць, дрэнна вучацца. Гэта такія студэнты, як Халюта, Нікулін, Шлемаў (п'яных іх затрымала міліцыя), такія, як Дашчэчка і Кузняцоў.

Каб пазбавіцца ад адмоўных з'яў, патрэбна мэтанакіраваная, сістэматычная работа ўсёй камсамольскай арганізацыі, накіроўваемай баявым камітэтам. Аб гэтым гаварылі ўсе выступіўшыя ў спрэчках.

У састаў новага камітэта камсамола юрфака выбрана 15 чалавек. Узначальвае яго В. Макееў.

**Н. НОВІКАВА.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

# ІХ ЧАКАЮЦЬ У ШКОЛАХ

У адказе сакратара камітэта камсамола хімічнага факультэта Алега Шадыры на пытанне, як працуе шэфскі сектар, я адчуў яго задавальненне і кіраўніком, і членамі гэтага сектара. Склалася ўражанне, што аб шэфскай рабоце хімікам ёсць што расказаць.

Асноўная іх работа вялася ў чатырох падшэфных школах горада Мінска, у школе № 6 г. Барысава і ў Радашковіцкай, Залужскай, Прылуцкай сярэдніх школах Мінскай вобласці. Адразу ж трэба адзначыць, што студэнты дапамагалі школьнікам не толькі авалодваць ведамі, але і ўмела арганізоўвалі іх культурны адпачынак. Так, напрыклад, у школе № 6 г. Барысава быў праведзен вечар — «Навука выкрывае рэлігію», а ў Радашковіцкай СШ — «Хімія і рэлігія». Многа расказвалі студэнты і аб сваім факультэце. Усяго ж у школах было праведзена 12 вечароў і каля 20 лекцый. Загадзя прайшлі падрыхтоўку 16 лектараў.

Ва ўсіх без выключэння школах былі аформлены стэнды па піянерскай тэматыцы, а таксама стэнды па прафесіянальнай арыентацыі вучняў, а ў Барысаўскай школе № 6 — піянерскі пакой.

Але больш за ўсё ўдзячны вучні і настаўнікі за афармленне хімічных кабінетаў. Яны сталі не толькі прыгажэйшымі, але і багацейшымі: папоўніліся новымі рэактывамі і прыборамі. Пабагацелі і школьныя бібліятэкі. Каля 300 кніг было сабрана студэнтамі для сваіх сяброў-школьнікаў. Гэта не толькі мастацкая, але і навуковая літаратура па хіміі і фізіцы.

Хімікі, цікавячыся жыццём малодшых сяброў, расказвалі і аб сваіх справах. На факультэце з ліку студэнтаў былі падрыхтаваны чатыры экскурсаводы. Навучэнцы кожнай падшэфнай школы пабывалі ў гасцях у хімікаў, жыва ўсім цікавіліся, і мне думаецца, што пасля кожнай такой экскурсіі не ў адным сэрцы загарэлася жаданне вучыцца ў светлых аўдыторыях хімфака. А такіх экскурсій было аж 22! Школьнікаў знаёмілі з Мінскам, вадзілі іх на экскурсію на завод «Тэрмапласт», у Дом-музей I з'езда РСДРП, музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а з мінскімі вучнямі арганізавалі паход на Курган Славы.

Цікава яшчэ і тое, што студэнты да сваіх агітбрыгад падключаюць і вучняў іншых школ. Так, камсамольцы школы № 90 г. Мінска выступілі з канцэртам у школе № 6 г. Барысава, а тыя ў сваю чаргу прыехалі да мінчан. Завязалася моцная дружба.

Многія студэнты-хімікі з'яўляюцца важатымі. У адной толькі 90-й школе г. Мінска іх 32 чалавекі. Яны праводзяць зборы атрадаў, гутаркі, віктарыны, дапамагаюць адстаючым, выпускаюць насценгазеты.

Настаўнікі шчыра дзякуюць студэнтам, лічаць іх сваімі памочнікамі ў выхаванні. Асабліва ўдзячны Святлане Цуранковай, Валерыю Грыцуну, Наташы Жукавай, Святлане Галубчык, Святлане Ваўчанковай, Людзе Крышкевіч і іншым.

Сёлета шэфскі сектар камітэта камсамола хімфака ўзначальвае Святлана Цуранкова.

— Нядаўна я пабывала ў некаторых школах, і ўсюды нас успамінаюць добрым словам, — гаворыць Святлана. — Думаю, што нам аб сваёй рабоце гаварыць не сорамна. Мы пастараемся, каб яна была яшчэ больш плённай.

**А. ХІЛІМОН,**
**студэнт.**



# ДОБРЫ ПАЧЫН ПЕРШАКУРСНІКАЎ

Адным з важнейшых на апошнім пасяджэнні камітэта камсамола гістфака было пытанне аб выніках падпіскі на газеты і часопісы. Адказны, член камітэта камсамола А. Бяляеў, паведаміў, што ў гэтым годзе 98 працэнтаў студэнтаў падпісаліся на камсамольскія выданні. Ён лічыць, што вялікая заслуга тут адказных за падпіску ў групах і на курсах, асабліва Т. Баляснікавай (III курс), Н. Парфянцова (IV курс аддз. палітэканоміі) А. Яноўскага (V курс аддз. гісторыі), С. Арамава (I курс аддз. палітэканоміі) і іншых.

Добры пачын зрабілі першакурснікі. Яны падпісаліся на 200 экземпляраў газет і часопісаў. Гэта значыць, што кожны камсамолец на курсе выпісаў не менш двух выданняў.

**Л. ФІНКЕЛЬШТЭЙН,**
**студэнтка гістфака.**

Супрацоўнікі кабінета гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў разам са студэнтамі-гісторыкамі падрыхтавалі да юбілею краіны пано «50-годдзе СССР — перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі».

Завяршаецца афармленчая работа і ў кабінеце гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў.

**На здымку:** студэнт I курса біяфака **Віктар Рызеўскі** афармляе святочны стэнд.

Фота **Д. Чаховіча.**

**У лістападзе 1945 года ў Лондане адбылася Міжнародная канферэнцыя моладзі, на якой 10 лістапада было прынята рашэнне аб стварэнні Сусветнай федэрацыі дэмакратычнай моладзі. З той пары па традыцыі дзень утварэння СФДМ адзначаецца як Сусветны дзень моладзі.**

# УНІВЕРСІТЭТ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ

У шматнацыянальнай студэнцкай сям'і БДУ можна пазнаёміцца з прадстаўнікамі з 22 краін свету. Той факт, што ў рэспубліцы, дзе да рэвалюцыі не было ні адной вышэйшай навучальнай установы, рыхтуюцца кваліфікаваныя спецыялісты для замежных краін, сведчыць аб вялікім аўтарытэце савецкай вышэйшай школы і нашага універсітэта ў прыватнасці. Каля дэканата па навучанню замежных грамадзян вісіць маляўнічы стэнд «БДУ — вну інтэрнацыянальная», на якім ад Мінска ў розныя бакі працягнуліся чырвоныя лініі ў напрамку краін, студэнты з якіх займаліся і займаюцца ва універсітэце. Іх — 29.

У 1961 годзе БДУ прыняў першых замежных студэнтаў, а зараз яго выпускнікоў можна сустрэць у Гане і Венесуэле, на Кубе і ў Самалі, у Афганістане і ў Польшчы, у В'етнаме і ў Камеруне. На стажыроўку ва універсітэт накіроўваліся спецыялісты з ЗША і Манголіі, Францыі і Мексікі, Канады і Японіі. У 29 краінах Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі цёпла ўспамінаюць аб Беларусі і Мінску многія былыя студэнты БДУ.

І універсітэт таксама можа ганарыцца сваімі выхаванцамі. Дырэктарам інстытута ядзернай фізікі АН Кубы працуе былы студэнт фізічнага факультэта Торрэс Ла Серна, у дзяржаўным камітэце па навуцы і тэхніцы пры СМ ДРВ — Нгуен Хак Тхі, былы студэнт з МНР Г. Шылагардзі зараз загадвае кафедрай ва Улан-Батарскім універсітэце.

Цяпер на асноўных і падрыхтоўчым факультэтах універсітэта навучаюцца 410 іншаземных студэнтаў.

Устаноўлены і з кожным годам развіваюцца і мацнеюць сяброўскія сувязі з зарубежнымі вну. Найбольш цеснае супрацоўніцтва з Іенскім і Гальскім універсітэтамі ГДР, Сафійскім універсітэтам, Кракаўскай вышэйшай педагагічнай школай і Варшаўскім універсітэтам, з універсітэтамі Будапешта і Любляны. Абмен групамі камсамольскага актыву, калектывамі мастацкай самадзейнасці, студэнцкімі будаўнічымі атрадамі — толькі некаторыя з форм гэтых сувязей.

Вялікая работа праводзіцца камітэтам камсамола БДУ па інтэрнацыянальнаму выхаванню савецкай і замежнай моладзі. Падпісаны дагаворы аб супрацоўніцтве паміж камітэтам камсамола БДУ і камітэтамі маладзёжных саюзаў студэнтаў з Балгарыі, ДРВ, Кубы, ГДР; рэгулярнымі сталі сустрэчы замежных і савецкіх студэнтаў, інтэрнацыянальныя вечары адпачынку. Па традыцыі кожны год праводзіцца фестываль дружбы. Усе замежныя студэнты прынялі ўдзел ва Усесаюзным ленінскім суботніку, студэнты з сацыялістычных краін паспяхова здалі Ленінскі залік.

Толькі ў летнім працоўным семестры прынялі ўдзел 50 в'етнамскіх студэнтаў. На будоўлях Беларусі працавалі 42 студэнты з Балгарыі і ГДР.

Частымі гасцямі сталі замежныя студэнты ў школах і на прадпрыемствах Мінска. Плённа працуе савет дружбы універсітэта — інтэрнацыянальны орган савецкіх і замежных студэнтаў. Многа сіл ва ўмацаванне інтэрнацыянальнай дружбы прыклалі студэнт з Судана Самір Шахін, ліванец Жак Антуан Амідзі, балгарка Люба Іванава, в'етнамец Чан В'ет Хунг і многія іншыя.

Замежныя студэнты жыва цікавяцца жыццём савецкіх людзей. Гэтая цікавасць не выпадковая. За 50 год свайго існавання Савецкі Саюз пераканаўча даказаў перавагі сацыялістычнага ладу. Вяртаючыся на радзіму, замежныя студэнты расказваюць аб савецкай рэчаіснасці і дасягненнях савецкага народа, якія здзяйсняліся на іх вачах.

Пачуцці замежных студэнтаў добра выказаў Ле Май Ань, які сказаў: «Мы вяртаемся дамоў, на радзіму. Але дзе б мы ні былі, мы заўсёды будзем памятаць, што тут, у Савецкім Саюзе, засталося некалькі год нашага жыцця, і мы можам лічыць і сябе савецкімі людзьмі... Мы назаўсёды захаваем пачуццё ўдзячнасці да савецкага народа, вялікага Леніна і пачуццё адданасці універсітэту, які мы будзем называць і «наш універсітэт».

Інтэрнацыянальная работа займае вялікае месца ў палітычным выхаванні моладзі. У ёй няма дробязей, і яе значэнне павышаецца з кожным годам. Павелічэнне колькасці замежных студэнтаў не толькі сведчыць аб усё ўзрастаючым аўтарытэце Савецкага Саюза ва ўсім свеце, але і прад'яўляе павышаныя патрабаванні да кожнага камсамольца, кожнага студэнта як будаўніка камунізму і інтэрнацыяналіста.

**Р. ЯНЧЫЛІК,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ па інтэрнацыянальнай рабоце.**

# ПЕРШЫ БЛІН КОМАМ?..

**Ідэя стварэння тэлегазеты другога курса журфака ўзнікла адразу пасля заканчэння сельгасработ. Аб тым, як працавалі студэнты ў бульбаводчых брыгадах калгаса імя Леніна Валожынскага раёна, як яны адпачывалі, і было вырашана расказаць з тэлевізійнага экрана.**

**Хутка выбралі вядучых. Вольга Ягорава і Ларыса Якавенка па яшчэ зусім свежых успамінах склалі сцэнарый, які адразу трапіў на суд пастаноўшчыкаў. Многа было спрэчак адносна тэксты пастаноўкі. Але ў гарачых дэбатах нарадзіўся абноўлены сцэнарый, дапоўнены новымі думкамі, цікавымі момантамі. І вось рукапіс ляжыць перад рэжысёрам Аркадзем Шульманам. Можна пачынаць рэпеціраваць.**

**Першая спроба была, відаць, самай доўгай і адказнай. У гэты дзень кожнаму трэба было дасканала азнаёміцца са сваёй справай. Уключана апаратура, і вока тэлекамеры выхапіла дыктараў Машу Шыманоўскую і Аляксандра Стукалу, якія карпатліва рэпеціруюць парнае чытанне. Сядзіць задуменна рэжысёр. Ён прадумвае тэкст сцэнарыя, нешта выкрэслівае, дапісвае, выпраўляе.**

**Але, бадай, лепш, чым каму, трэба ведаць сцэнарый памочніку апаратара Таццяне Шафарэвіч. У яе пад рукамі цэлы стос здымкаў, якія трэба пранумараваць, раскласці на свае месцы, каб у час здымак не заблытацца, а хутка мяняць адну застаўку за другой.**

**Непрыкметна падкраўся і час генеральнай рэпетыцыі, якая адбылася за гадзіну да выхаду ў эфір.**

**Цішыня ў студыі. Урэшце чуюцца пазыўныя. Музычныя рэдактары Аляксандр Цітавец і Таццяна Бумажкова падключаюць музыку. Канчаецца музычнае афармленне. Уступаюць дыктары. Астатнія моўчкі чакаюць сваёй чаргі. Усё ідзе добра...**

**Генеральная закончана, расстаўлены ўсе кропкі над «і». Праз некалькі хвілін трансляцыя на вестыбюль корпуса журфака.**

**А там ужо з нецярплівасцю і цікавасцю чакае натоўп гледачоў. Гэта — галоўныя рэцэнзенты. Яны потым выкажуць свае думкі аб тэлегазеце. Сярод гледачоў многа першакурснікаў, ёсць студэнты з юрфака. Не менш зацікаўлены перадачай і выкладчыкі. Яны таксама прыйшлі паглядзець другі курс на тэлеэкране.**

**А ў студыі хваляванне. Няўжо першы блін комам! Аркадзь Шульман падае знак. Усталявалася цішыня, трансляцыя пачалася.**

**...Гучаць апошнія словы дыктараў. Перадача закончана. У студыю заходзіць першы памочнік і натхніцель маладых пастаноўшчыкаў Аза Аляксееўна Плаўнік.**

**— Ну як! — выдыхнулі ўсе разам.**

**— Аб гэтым запытайцеся ў гледачоў, — адказвае яна.**

**В. ХАРЫТОНАЎ,**
**аператар, II курс журфака.**



**СТУДЭНЦКІЯ БУДНІ**

*НА ЗДЫМКАХ: практыкум па фізіялогіі чалавека і жывёл у студэнтаў III курса біялагічнага факультэта. Вывучаецца нервовая рэгуляцыя работы сэрца.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*





# ЧАС САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ.

## *ЯК ЯГО ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ?*

САМАСТОЙНАЯ работа студэнта. Звычайна яе разумеюць як не прадугледжаны вучэбным планам час пазааўдыторных заняткаў, у працэсе якіх студэнт вывучае праграмныя пытанні лекцыйных курсаў, працуе над наглыбленнем і расшырэннем ведаў па іх, самастойна рыхтуецца да практычных або семінарскіх заняткаў.

**Калі ў сярэдняй школе кантроль за самастойнай працай вучняў праводзіцца штодзённа на ўроках, у час праверкі дамашніх заданняў, то ў вну кантроль за самастойнай работай студэнта здзяйсняецца не кожны дзень, а ў час практычных, семінарскіх заняткаў, калёквіумаў, праверкі кантрольных і курсавых работ, на заліках і экзаменах. І гэта невыпадкова. Сістэма працы вну разлічана на людзей, у якіх ужо выхаван свядомы падыход да вучобы, якія свядома выбралі сабе спецыяльнасць і гэтак жа свядома авалодваюць ёю. Уводзіць у вну сістэму штодзённых дамашніх заданняў і штодзённага кантролю за самастойнай працай студэнтаў — значыць у некалькі разоў падоўжыць тэрмін навучання, зрабіць яго працэс больш дарагім для дзяржавы і ў пэўнай меры менш рэнтабельным. Вось чаму вну робяць даволі лагічную стаўку на сумленны падыход студэнтаў да вучэбнай работы. Свядомыя адносіны студэнтаў да вучобы перш за ўсё праяўляюцца ў іх сістэматычнай і строга арганізаванай пазааўдыторнай рабоце. Значэнне гэтай работы для фарміравання добрага спецыяліста ніколькі не меншае, чым значэнне праслуханых лекцый.**

**Ні адзін выкладчык, няхай ён будзе выдатным знатаком сваёй дысцыпліны і не менш цудоўным лектарам, не забяспечыць добрага ведання свайго курса студэнтамі, калі апошнія не будуць самі актыўна працаваць над вывучэннем прадмета не толькі на лекцыях, практычных і семінарскіх занятках, але і ў свабодны ад гэтых заняткаў час. А бывае ж і такое, што на вывучэнне складанай праграмы таго ці іншага курса адводзіцца вучэбнымі планамі недастатковая колькасць гадзін. Выкладчык у такіх выпадках вымушан толькі найбольш складаныя тэмы выкладаць паглыблена, менш складаныя — аглядна, а самыя простыя — даваць вывучыць самастойна. Значэнне самастойнай работы студэнтаў над курсам у даным выпадку ўзрастае. Нават і тады, калі выкладчык мае час для паглыбленага тлумачэння ўсіх тэм курса, ён не забяспечвае ў поўнай меры ведання прадмета ў сваіх слухачоў (пры ўмове, што яны актыўна працуюць на лекцыях, вядуць канспекты і добра разумеюць матэрыял). Справа ў тым, што ў псіхалагічную структуру ведаў уваходзіць не толькі добрае разуменне вучэбнага матэрыялу, але і трывалае замацаванне зразумелага ў памяці.**

**А для таго, каб замацаваць у памяці вучэбны матэрыял, неабходна неаднаразова яго паўтараць, што ў поўнай меры можна зрабіць толькі ў час самастойнай вучэбнай работы. Як бачым, і ў гэтым выпадку роля самастойнай вучэбнай работы студэнта вельмі вялікая. Па-сапраўднаму авалодаць дысцыплінай, значыць не толькі ведаць матэрыял падручніка, але і дадатковую літаратуру, для вывучэння якой неабходны самастойныя заняткі.**

Як бачым, значэнне самастойнай работы вялікае. І бывае крыўдна, калі сутыкаешся са студэнтамі, якія не працуюць над сабой, растрачваюць каштоўны час вучобы. Гэтыя студэнты, як правіла, «штурмуюць» праграмны матэрыял перад экзаменам або залікам, маюць дрэнныя або пасрэдныя адзнакі, за імі часта цягнуцца «хвасты» розных акадэмічных запазычанасцей, з іх калі і атрымліваюцца, то даволі пасрэдныя спецыялісты.

Мой юны сябар! Час вучобы ва універсітэце не бясконцы, і гэтым часам трэба даражыць. Многія не задумваюцца над тым, як неразумна запаўняюць асобныя яго прамежкі, з якіх пасля могуць скласціся бескарысна пражытыя месяцы, а то і гады. Згублены час самастойнай вучэбнай работы вельмі дорага абыходзіцца дзяржаве, якая траціць вялікія сродкі на падрыхтоўку са студэнта добрага спецыяліста.

Статыстыка гаворыць, што калі кожны рабочы будзе траціць толькі адну мінуту свайго рабочага часу ў дзень, то за год нашай краіне гэта прынясе ўбытак у 50 мільёнаў рублёў. На такую суму можна пабудаваць 10 тысяч кватэр.

На жаль, статыстыцы невядома, колькі кватэр, кінатэатраў і дзіцячых ясляў змагла б пабудаваць дзяржава за кошт сродкаў, адпускаемых вну, якія парой марна ідуць на некаторых нядбайных студэнтаў.

Вось чаму і наспела ў мяне думка напісаць артыкул, у якім я стаўлю пытанне аб святым абавязку кожнага студэнта добрасумленна адносіцца да вучэбнай работы ў вну, аб тым, як выкарыстоўваць час самастойнай работы з максімальнай карысцю.

Мне хочацца даць некаторыя парады:

**Перш за ўсё,** самастойная работа павінна быць сістэматычнай. Толькі ў выпадку сістэматычных практыкаванняў сфарміруюцца як навыкі самастойнай вучэбнай работы, так і патрэба ў ёй, прывычка да гэтай работы.

Складзіце для сябе дастаткова строгі расклад самастойных заняткаў па асобных прадметах, укажыце ў ім дні тыдня, калі вы будзеце працаваць над вучэбнай і дадатковай літаратурай па тых ці іншых курсах. Складаць расклад, г. зн. планаваць самастойную работу лепш у канцы кожнага вучэбнага тыдня на тыдзень уперад з улікам неабходнасці паглыблення і замацавання ведаў па тэмах праслуханых лекцый, падрыхтоўкі да будучых семінараў і практычных заняткаў з улікам складанасці саміх прадметаў і г. д. Пры гэтым на самастойную работу па прафіліруючых прадметах, а таксама філасофіі марксізму - ленінізму адводзьце больш часу, чым на самастойную работу па іншых прадметах, не забываючы, аднак, і апошніх.

**Студэнту стацыянара** лепш за ўсё прымацца за самастойную працу пасля абеду і добрага адпачынку ад аўдыторных заняткаў, інакш работа не будзе плённай і не прынясе задавальнення.

Студэнтам вячэрняга аддзялення, канешне, лепш выкарыстоўваць для самастойнай работы дні, свабодныя ад аўдыторных заняткаў.

Сачыце за тым, каб памяшканне, дзе вы працуеце, было добра праветрана: кісларод патрэбен для актыўнай работы мозгу. Адчуўшы стому, зрабіце перапынак. Затым зноў сядайце за працу, але ўжо на больш кароткі прамежак часу. Пасля повага адчування стомленасці заканчвайце сваю работу і лічыце, што сумленна выканалі свой доўг.

Рэгламентаваць час вашай самастойнай падрыхтоўкі я, канешне, не магу, але думаю, што калі тры-чатыры дні ў тыдзень ёй будзе ўдзелена па дзве-тры гадзіны, то можна зрабіць вельмі многае.

**Памятайце,** што лепш за ўсё займацца ў чытальнай зале бібліятэкі або ў **прадметных кабінетах:** там заўсёды знойдзеце патрэбную вучэбную і дадатковую літаратуру, ды і самі ўмовы тут дабратворныя для плённай работы. У інтэрнаце такіх умоў няма. Акрамя таго, працуючы ў кабінеце, вы заўсёды зможаце выкарыстаць наглядныя дапаможнікі, праграмы, дэманстрацыйныя прыборы, спісы дадатковай літаратуры па розных тэмах курса.

**У час работы над вучэбнай літаратурай або першакрыніцамі** вядзіце запіс асноўных думак аўтара ў форме простага або разгорнутага плана, тэзісаў або канспекта. Падрабязна аб тым, як весці гэтыя запісы, расказвала газета «Беларускі універсітэт» 12 кастрычніка 1972 г. (гл. артыкул «Як працаваць над першакрыніцамі»).

Запіс асноўных палажэнняў літаратурных першакрыніц дапаможа лепш іх засвоіць і запомніць. Пры гэтым не спяшайцеся запісваць тыя палажэнні, у логіцы якіх не разабраліся: спачатку зразумейце матэрыял, а пасля ўжо запісвайце. Добра зразуметы матэрыял запамінаецца хутчэй і больш трывала, а ўдзел зрокавай і маторнай памяці пры яго канспектаванні або іншых формах запісу зробіць працэс запамінання яшчэ больш прадуктыўным. Запісваючы, выдзяляйце найбольш істотныя палажэнні і старайцеся запомніць іх як можна лепш: мэтавая ўстаноўка на запамінанне сэнсавых «апорных пунктаў» вывучаемага матэрыялу прыводзіць да больш трывалага запамінання не толькі асноўных палажэнняў тэмы, але і многага іншага, што звязана з асноўнымі палажэннямі і падмацоўвае іх.

**Амерыканскі даследчык Джонс (Калумбійскі універсітэт) устанавіў, што на цудоўных лекцыях аднаго вядомага прафесара сярэдні працэнт засваення студэнтамі выкладзенага матэрыялу склаў прыкладна 71,6 працэнта. Па ўмовах эксперыменту студэнты не паўтаралі ўспрыняты на лекцыі матэрыял. Пісьмовыя апытанні, праведзеныя Джонсам праз розныя прамежкі часу, паказалі, што праз 3—4 дні ў студэнтаў засталося ў памяці толькі 45,3 працэнта засвоенага на лекцыі матэрыялу, праз тыдзень — 34,6, праз два тыдні — 30,6, праз 8 тыдняў — 24,1 працэнта. Як бачым, забыццё вучэбнага матэрыялу ідзе асабліва актыўна ў першы час пасля яго ўспрыняцця: у першыя два тыдні (пры ўмове, калі мы яго не паўтараем). А пасля застаўшаяся ў нашай памяці нязначная частка раней успрынятага матэрыялу забываецца ўжо не так інтэнсіўна: усё марудней і марудней.**

**Вось чаму, калі вы сядаеце за паўтарэнне ўспрынятага на лекцыі матэрыялу толькі праз некалькі месяцаў (перад самай сесіяй), у галаве ад праслуханых лекцый нічога не застаецца.**

**Каб не забыць засвоены на лекцыях матэрыял,** вярніцеся да яго: паўтарыце на другі дзень пасля лекцый, інакш ваша праца на лекцыі будзе нерэнтабельнай. Пайдзіце ў кабінет, уважліва прагледзьце канспект праслуханай лекцыі, прачытайце па той жа тэме адпаведны раздзел падручніка і папрацуйце над дадатковай літаратурай. Праз тыдзень-паўтара бегла прагледзьце канспект гэтай жа лекцыі, тэзісы або канспект дадатковых літаратурных крыніц. Гэта будзе гарантыяй, што атрыманыя веды вы не толькі добра замацуеце ў памяці, але і паглыбіце. Такім жа чынам працуйце над матэрыялам кожнай лекцыі. А калі прыйдзе час рыхтавацца да экзамена ці заліку, вы лёгка ўспомніце асноўны матэрыял праслуханага курса.

Калі ў час самастойнай падрыхтоўкі вы будзеце працаваць над літаратурай па тэмах розных курсаў, **пачынайце падрыхтоўку з самага цяжкага для сябе прадмета** і далей размяркоўвайце прадметы па лініі меншай цяжкасці.

Па-першае, у пачатку работы мозг мае больш энергіі, чым у канцы, а гэта значыць, што вы зможаце добра выканаць больш цяжкую работу. К канцу працы запасы рабочай энергіі мозгу некалькі ўбываюць, і па сіле аказваецца менш складаная работа. Па-другое, пры такой паслядоўнасці прадметаў у час іх падрыхтоўкі памяншаецца дзеянне так званага рэтраактыўнага тармажэння ў меншай ступені пры засваенні матэрыялу наступнага прадмета выцясняецца з памяці матэрыял раней падрыхтаванага...

Пытанне аб самастойнай рабоце студэнта настолькі сур'ёзнае, што ім глыбей павінен заняцца камсамол. Усе грамадскія мерапрыемствы трэба планаваць так, каб у студэнта заставаўся час для самастойнай вучэбнай работы.

**Р. ВАДЭЙКА,**
**в. а. дацэнта кафедры педагогікі і псіхалогіі, кандыдат псіхалагічных навук.**

# НА ДРУГОЙ ПРЫСТУПЦЫ

Ну, вось мы і на другім курсе, на другой прыступцы студэнцкага жыцця. Нямнога пакуль, праўда? Але давайце азірнемся назад, у мінулы год. І тут высветліцца, што пазналі мы многае, навучыліся самастойна пераадольваць цяжкасці, дзяліць з сябрамі і радасць, і бяду. Спачатку не паспявалі ўсё засвойваць, за ўсім сачыць: вялікі аб'ём новай інфармацыі літаральна ўзяў у палон. А потым аказалася, што можна і лекцыі добра пісаць, і з практычнымі своечасова спраўляцца.

Вынікі нашага жыцця на першым курсе мы падзялі нядаўна на справаздачна-выбарным камсамольскім сходзе. Пастаўленыя пытанні абмяркоўвалі бурна, спрачаліся, раіліся. Да ўсяго падыходзілі прама, адкрыта адзначалі і добрыя, і дрэнныя бакі дзейнасці камсамольскага актыву.

Заслухаўшы справаздачы камсоргаў і адказных за сектары, работу актыву прызналі здавальняючай. Затым выбралі новых членаў бюро — камсамольцаў, якія ўмеюць працаваць з агеньчыкам. У іх ліку Л. Смолій, Г. Таратынко, С. Рэйзман, В. Кажэнава, Н. Пятроў, Л. Гурганава, Л. Міранозіч.

Адчуваецца, што ў гэтым годзе жыццё студэнтаў будзе больш цікавым. За першы ж курс мы добра пазналі друг друга, адкрыліся многія таленты. Нас здружыў гоман светлых аўдыторый, дым кастроў і палатачны лагер, старанная праца на будоўлі і на калгасным полі.

На першы семестр намечаны цікавыя мерапрыемствы: агляд мастацкай самадзейнасці курса, спартыўныя спаборніцтвы, культпаходы, навуковыя даклады. Хочацца толькі пажадаць сваім сябрам поспехаў ва ўсіх справах, задору, дружбы, згуртаванасці, упэўненасці ў сваіх сілах.

**А. АПАНАСЁНАК,**
**студэнтка ІІ курса геафака.**

## ЯК СПРАВЫ, СТУДЭНТ!

# НАРАДЖАЕЦЦА КАЛЕКТЫЎ

Ідучы па калідоры факультэта прыкладной матэматыкі, я зазірнула ў адну з аўдыторый. Тут панавала цішыня — першакурснікі пісалі кантрольную. Па іх тварах было відаць, што работа сур'ёзная...

Увогуле першакурснікі ФПМ па-сапраўднаму ўзяліся за вучобу, актыўна ўключыліся ў грамадскае жыццё факультэта. На аглядзе мастацкай самадзейнасці яны выступілі з танцамі, песнямі, паказалі нават свой тэатр мініяцюр. Пакуль не выклікае нараканняў наведванне заняткаў. Добра прайшла падпіска на перыядычныя выданні.

У жыцці першага курса зараз адбываецца вельмі важны працэс: ідзе стварэнне, умацаванне калектыву. Ці быць яму дружным, згуртаваным, залежыць у першую чаргу ад камсамольскіх важакоў. Вельмі добра, напрыклад, зарэкамендавала сябе чацвёртая група. Радуюць яе дзелавыя адносіны да вучобы, актыўнасць, сяброўская зацікаўленасць да таварышаў. Рыхтуючыся да дня нараджэння камсамола, актывісты, напрыклад, распаўсюдзілі анкету з пытаннямі, якія датычаць практыкі камсамольскай работы, вобліку камсамольца будучага часу.

Няма ніякага сакрэту, што першакурснікам спачатку вельмі цяжка. Менавіта зараз многія з іх спрабуюць адказаць на пытанне: «Ці правільна я выбраў прафесію, ці атрымаецца з мяне добры спецыяліст?» Акрамя таго, вучоба на ФПМ патрабуе шмат часу і намаганняў. Многа новых складаных прадметаў, такіх, напрыклад, як матэматычная логіка. Часта праходзяць праверачныя работы. Вось тут бы і дапамаглі старшакурснікі, камітэт камсамола факультэта. Хіба яны не зацікаўлены ў добрай паспяховасці сваіх таварышаў, у тым, як ідуць справы?! Зусім няцяжка хоць раз у тыдзень зайсці да першакурснікаў, нешта параіць, дапамагчы, падбадзёрыць. Але — гэта адзначаў яшчэ на справаздачна-выбарным сходзе сакратар першага патока П. Гаранін — такія госці тут рэдкія.

Прайшло два месяцы, як пачаліся заняткі. Але толькі зараз камітэт камсамола намеціў канкрэтныя меры дапамогі студэнтам першага курса. Было б добра, каб тое, што запланавана, было выканана.

**С. ШЫДЛОЎСКАЯ,**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

# НЕ ПАДВЯДЗЁМ!

У мінулым засталіся перадстудэнцкія хваляванні. А колькі цікавага чакае нас, будучых географаў, наперадзе! З усёй сардэчнасцю дзякуем мы прафесарска-выкладчыцкаму калектыву, старшакурснікам за цёплы прыём нас у рады студэнцтва. Мы запэўніваем, што аддадзім усе сілы, энергію, веды, накопленыя ў школе, для авалодання будучай прафесіяй.

Пакінуўшы універсітэт, мы пастараемся быць сапраўднымі будаўнікамі камунізму.

Шукаць, тварыць — вось наш дэвіз, старшакурснік!

**Д. КУЛІНІЧ,**
**студэнтка І курса геафака.**



*З лістапада сквер на плошчы імя Якуба Коласа не мог змясціць усіх, хто прыйшоў на адкрыццё помніка народнаму паэту Беларусі.*

*Ужо некалькі дзён узвышалася сярод сасёнак і маляўнічых бяроз бронзавая постаць «дзядзькі Якуба», акружанага героямі яго кніг. Але калі Міхась Лынькоў зняў пакрывала з помніка, у кожнага, хто прыйшоў на спатканне з любімым паэтам, мацней забілася сэрца.*

*Мудра глядзіць народны паэт на тых, каго ён любіў, дзеля каго ён пісаў, і нібы кажа: «Я заўсёды, заўсёды з вамі».*

*Тэкст і фота А. Цыгулёва.*



# ІСКРЫСТА, ЗАХАПЛЯЮЧА...

Гасцямі нашага універсітэта на гэты раз быў ансамбль танца з Сафіі. Гэты калектыў добра вядомы не толькі ў Балгарыі. Студэнты прадстаўлялі сваю краіну на сцэнах Францыі, Румыніі, Іспаніі, Фінляндыі, Югаславіі і шэрагу іншых краін. Усюды ім спадарожнічаў поспех. На сёмым і дзевятым фестывалях мастацтваў Балгарыі ансамбль танца атрымаў залатыя медалі. Мастацкі кіраўнік ансамбля — заслужаны артыст Народнай Рэспублікі Балгарыі Іван Тодараў.

І вось першае выступленне на сцэне нашага універсітэта. Артысты спачатку крыху хвалююцца: гэта ж першае выступленне ў Савецкім Саюзе. Але хваляванне хутка растварaецца ў задорным, захапляючым гледачоў танцы.

Вядома, што братняя Балгарыя славіцца ва ўсім свеце сваімі ружамі. Таму першае выступленне ансамбль пачаў танцам «У ружовым садзе». Прыгожыя дзяўчаты ў чырвоных хусцінках і ярніх нацыянальных касцюмах, бы тыя чароўныя кветкі Балгарыі. На змену гэтаму танцу прыходзіць задорны і вясёлы «Маладосць Тракіі». Гісторыя яго такая. Ёсць у Тракіі, адной з абласцей краіны, звычай: на народных святкаваннях хлопцы, каб паказаць сваё майстэрства і спрыт перад дзяўчатамі, стараюцца пераганцаваць адзін другога. За выкананне гэтага танца ўдзельнікі ансамбля атрымалі найбольш апладысментаў і неаднаразова выклікаліся на сцэну.

Канцэрт працягваецца. Выконваюцца як народныя, так і сучасныя балгарскія танцы. «Джынарская», напрыклад, вельмі нагадвае рускую кадрыль. Упаўне сучасная інтэрмедыя «Зайцы». Потым танец «Дзявочы», напоўнены мяккай лірычнасцю. Гэта асеннія размовы дзяўчат, якія збіраюцца выходзіць замуж. Яны бываюць то вясёлыя, то сумныя.

І зноў ударыў весела барабан, зайграў акардэон і палілася, завіхурылася вясёлая «Шопская сюіта».

Удзельніца ансамбля Андрыяна Георгіева выканала некалькі народных песень, а аркестравая група — балгарскія народныя мелодыі.

Канцэртную праграму ансамбль завяршыў самым папулярным у Балгарыі танцам «Рэчаніца».

Крыху стомленыя, але шчаслівыя ад такога шчырага прыёму, балгарскія артысты развітваюцца з намі. Ім дораць дзесяткі букетаў кветак, удзячна паціскаюць рукі.

Ад імя рэктарата, парткома, камітэта камсамола сакратар камітэта камсамола універсітэта Алег Слука звяртаецца да дарагіх гасцей са шчырымі словамі падзякі.

— Нас радуе мастацтва братняй рэспублікі, — гаворыць ён. — У знак шчырай дружбы і павагі дазвольце ўручыць вам сувенір-сімвал Беларусі — белавежскага зубра.

Зала ўстае, грымяць працяглыя апладысменты.

**М. ШЛЫК.**

Фота М. Нечыпарэнкі.




**Дарагія сябры!**

**Працягваецца падпіска на шматтыражную газету «Беларускі універсітэт».**

**Каб заўсёды быць у курсе універсітэцкіх спраў, абавязкова выпішыце сваю газету.**

*Кошт гадавой падпіскі 1 руб. Аформіць яе можна ў грамадскіх распаўсюджвальнікай друку.*

*За даведкамі звяртайцеся ў камітэт камсамола БДУ і ў рэдакцыю.*


# ГАРАДСКІ РУХ І ЯГО ЎДЗЕЛЬНІКІ

З мінулага года ў нашай газеце рэгулярна публікуюцца матэрыялы супрацоўнікаў дзяржаўтаінспекцыі Упраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкома па розных пытаннях бяспекі руху.

Публікуючы сёння чарговы матэрыял, мы звяртаемся да нашых чытачоў з просьбай выказаць свае меркаванні і прапановы па бяспецы руху ў нашым горадзе. Цікава было б даведацца, па якіх пытаннях пажадана было б арганізаваць у бліжэйшы час выступленні членаў нашага нештатнага аддзела «За бяспеку руху».

Значна ўзрасла за апошнія гады інтэнсіўнасць руху на вуліцах нашага горада. Зараз на галоўнай артэрыі Мінска — Ленінскім праспекце — праз асобныя яго перакрыжаванні праходзіць у гадзіну каля пяці тысяч машын і звыш шасці тысяч пешаходаў.

Зразумела, што вуліцы для такой масы транспарту становяцца ўжо вузкімі, і толькі нязменна высокімі працягваюць заставацца патрабаванні да вадзіцеляў — забеспячэнне вялікіх хуткасцей і беспечнага руху. Апошняе, дарэчы, становіцца найвялікшай праблемай часу, якую спрабуюць рашыць ва ўсіх буйных гарадах свету. Рашаецца гэтая праблема і ў нас, у Мінску.

Нядаўна, напрыклад, гэтае пытанне было вынесена на пасяджэнне бюро гаркома партыі і гарвыканкома, дзе прызналі, што наш Ленінскі праспект зараз ужо не забяспечвае нармальны рух пры такой вялікай яго інтэнсіўнасці. А таму ў найбольш небяспечных месцах — перасячэннях праспекта з вуліцамі Камсамольскай, Урыцкага, Леніна — вырашана пабудаваць падземныя пераходы.

Будзе ўведзена ў эксплуатацыю ўнутранае транспартнае кальцо, якое дазволіць значна разгрузіць цэнтральную частку горада.

У многіх пунктах горада, якія зараз лічацца найбольш «гарачымі» ў аварыйных адносінах і якія не забяспечаны сродкамі рэгулявання, плануецца ўвесці светафорную сігналізацыю. Многія вуліцы расшыраюцца.

Але няправільна было б меркаваць, што дарожныя няшчасці, якія так часта маюць месца на нашых вуліцах, здараюцца з-за недахопаў у арганізацыі руху. Як паказвае аналіз, пераважная колькасць іх адбываецца з-за недысцыплінаванасці вадзіцеляў і пешаходаў, і асабліва апошніх.

Не зусім прыемна, але неабходна адзначыць, што далёка не цесная дружба з правіламі вулічнага руху звязвае і студэнтаў БДУ. Я дазволю сабе назваць імёны некаторых: студэнт IV курса гістфака Віктар Дзянісаў, студэнткі біяфака Ірына Казакевіч і Тамара Філітончык, студэнты Віктар Кукушкін і Таццяна Асяева. Нядаўна яны аштрафаваны за няправільны пераход вуліцы.

Мне хацелася б сказаць гэтым таварышам: сёння вас аштрафавала міліцыя, а заўтра пакарае сама вуліца. І гэта можа быць вельмі суровая кара. Дык ці не лепш своечасова зрабіць адпаведныя вывады?

**Р. АЎРАМЕНКА,**
**інструктар ДАІ УУС Мінгарвыканкома.**


Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 02432 Заказ 1312.